Брно, 15 лістапада 2020

# Заснаванне Амбасады незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы

**Цэнтр эксперыментальнага тэатра ў Брне, да якога належаць тэатры “Гусь на канаце” (“Husa na provázku”), “HaDivadlo” і тэатральная платфома “Terén”, засноўваюць у Брне Амбасаду незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы. Адкрыццё амбасады сімвалічна прызначана на 17 лістапада, калі ў Чэхіі святкуецца Дзень барацьбы за свабоду і дэмакратыю.**




Чэхі маюць гістарычны досвед як таталітарызму, так і грамадскіх пратэстаў супраць недэмакратычнага рэжыму і іх задушэння. Таму Цэнтр эксперыментальнага тэатра (ЦЭТ) у апошнія месяцы напружана сочыць за падзеямі ў Беларусі, дзе людзі ўжо чацвёрты месяц, нягледзячы на масавыя арышты, турэмныя тэрміны, жорсткія рэпрэсіі і запалохванне, упарта змагаюцца за справядлівыя выбары, свабоду і дэмакратыю.

У аўторак 17 лістапада 2020 г. мы адзначаем угодкі Аксамітнай рэвалюцыі і перамогу свабоды і дэмакратыі ў нашай краіне. ЦЭТ у гэты важны дзень хоча прыпомніць запавет Вацлава Гаўла і скарыстацца этасам гэтага векапомнага дня, каб звярнуць увагу на тое, што ў нашы дні адбываецца ў Беларусі.

“Мы разважалі, якую форму найлепей выбраць, і сышліся на тым, што ладзіць разавую дыскусію ці падобную імпрэзу – не вельмі мэтазгодна, значна важней у больш працяглым гарызонце праводзіць інфармаванне шырокай грамадскасці пра тое, што ў гэтыя дні дзеецца ў Беларусі. Людзі ў сярэдняй і заходняй Еўропе, на жаль, ведаюць пра гэтую краіну вельмі мала; мы перакананыя, што незалежная беларуская культура і агульны кантэкст цяперашніх

Centre for Experimental Theatre
Zelný trh 9, 602 00 Brno, Czech Republic; www.ced-brno.cz
TAX ID: CZ00400921, Company registration number: 00400921

падзей у Беларусі неабходна значна выразней прэзентаваць у грамадскай прасторы”, – кажа дырэктар Цэнтра эксперыментальнага тэатра Міраслаў Ошчатка і далей дадае: “Таму мы пастанавілі пры нашых тэатрах у Брне ўвесці пасаду амбасадара незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы. У наступныя тыдні і месяцы гэты чалавек будзе ладзіць не толькі сустрэчы ці лекцыі аб беларускай культуры, але таксама выпрацоўваць рэгулярны агляд важных грамадска-культурных падзей у Беларусі, які будзе шырока рассылацца СМІ і культурным установам Чэшскай Рэспублікі. На пасаду амбасадара мы выбралі Сяргея Сматрычэнку, які ўжо нямала гадоў у значнай ступені спрыяе ўзаемапазнанню чэшскай і беларускай культур”.

Апрача беларускага грамадзянства, Сматрычэнка мае і чэшскае, у цяперашні час ён з сям’ёй жыве ў Брне. Кароткую біяграфію Сяргея Сматрычэнкі і папярэдні план дзейнасці новапаўсталай амбасады можна знайсці ў самастойных дадатках.

“Я адчуваю, што чэшская культурна-мастацкая сцэна мае ахвоту і гатовасць падтрымаць сваіх беларускіх калег і ўсё беларускае грамадства ў часе іх змагання за творчую свабоду, а ўласна і ў змаганні за звычайнае выжыванне. Мы б толькі хацелі дадаць гэтай гатовасці імпульс і парэбны кірунак. У той жа час неаспрэчна тое, што беларуская культура, насуперак ці часам і дзякуючы складанасцям, мае што прапанаваць чэшскай публіцы”, – сказаў новапрызначаны амбасадар Сяргей Сматрычэнка.

Цэнтр эксперыментальнага тэатра і Амбасада незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы таксама падтрымліваюць кантакт з сябрамі Каардынацыйнай Рады, якія пра нашу дзейнасць ведаюць і цалкам яе падтрымліваюць.

Праект Амбасады незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы фінансава падтрымлівае і мэрыя горада Брно.

“Заснаванне Амбасады незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы – гэта чарговы крок горада Брно ў падтрымцы беларускіх грамадзян у іх змаганні за свабоду і дэмакратыю. Адкрыццё амбасады мы сімвалічна прымеркавалі да 17 лістапада, г.зн. да Дня барацьбы за свабоду і дэмакратыю, да даты, якая і нашаму народу дала надзею. Акрамя культурніцкіх ініцыятыў гэтая незалежная ўстанова будзе займацца таксама інфармаваннем пра тое, што адбываецца ў Беларусі”, – сказаў Томаш Колачны, 2-і намеснік мэра.

“Да падтрымкі беларускіх грамадзян у змаганні за свабоду і дэмакратыю мы, г.зна. кіраўніцтва горада, далучыліся яшчэ ў сярэдзіне жніўня, стаўшы першым горадам у Чэшскай Рэспубліцы, які на будынку мэрыі вывесіў гістарычны беларускі сцяг, сімвал пратэстаў супраць сфальсіфікаваных выбараў. Гэты сцяг з нагоды адкрыцця амбасады мы сімвалічна перанясем і вывесім на будынку тэатра “Гусь на канаце”. У беларускія колеры і надалей застаецца ўбраны і шчыт маркграфа Ёшта на помніку на Мараўскай плошчы”, – дапоўніў Марэк Фішэр, які ў мэрыі адказвае за культуру.

Сэнсам заснавання амбасады ёсць папулярызацыя беларускай незалежнай культуры, якая

цяпер у Беларусі знаходзіцца пад значным уціскам. У той жа час амбасада будзе спрыяць таму, каб жыхары Чэхіі мелі лепшы доступ да інфармацыі аб актуальных падзеях у Беларусі. ЦЭТ лічыць стварэнне такога моста значным і важным. Пры гэтым падкрэслівае, што амбасада не мае палітычнага фармату, гэта культурніцкі праект, скіраваны на незалежную і свабодную беларускую культуру і яе праявы ва ўсёй шырыні і разнастайнасці.

“Мы не палітыкі, мы творцы. Аднак мы верым у сілу культуры і яе здольнасць прыцягнуць на свой бок людзей дзеля добрай справы. У рэшце рэшт, менавіта тэатры, творцы і студэнты сталіся рухавіком зменаў у нашай краіне”, – падсумоўвае дырэктар Цэнтра эксперыментальнага тэатра Міраслаў Ошчатка.

**У аўторак 17 лістапада ў 11.30**
адбудзецца сімвалічнае адкрыццё
Амбасады незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы
перад тэатрам “Гусь на канаце”.
У адкрыцці амбасады возьмуць удзел дырэктар ЦЭТ Міраслаў Ошчатка,
амбасадар Сяргей Сматрычэнка, намеснік мэра Томаш Колачны
і загадчык па культуры ў гарадской радзе Марэк Фішэр.

www.facebook.com/anbelkult

www.ced-brno.cz

Міраслаў Ошчатка
дырэктар ЦЭТ

m.: +420 739 471 650
t.: +420 542 123 426
oscatka@ced-brno.cz

Zelný trh 9, 602 00 Brno
Czech Republic

## Сяргей Сматрычэнка



Нарадзіўся ў 1977 г. у Віцебску, рос у беларускай сталіцы. У 1994 г. скончыў Беларускі гуманітарны ліцэй, у якім упершыню сутыкнуўся з чэшскай мовай. Наступныя 5 гадоў вывучаў беларускую філалогію ў БДУ, а самастойна ці ў якасці вольнага слухача з маладзейшым курсам таксама чэшскую мову (як спецыяльнасць багемістыка з'явілася ў БДУ толькі ў 1996 г.). Скончыўшы ўніверсітэт у 1999 г., застаўся ў ім выкладаць, найперш чэшскую мову, пазней і славацкую, а таксама розныя славістычныя дысцыпліны. У БДУ працаваў да канца 2010 г., з 2-гадовым перапынкам, калі ў Венскім універсітэце выконваў абавязкі асістэнта. На мяжы 2010/2011 гг. праз сваю грамадзянскую пазіцыю з БДУ мусіў сысці, а праз паўгода пераехаў у Чэшскую Рэспубліку. З сям'ёй пасяліўся ў Брне, з часам атрымаў і чэшскае грамадзянства. У апошнія гады выкладае чэшскую мову для іншаземцаў, таксама працуе турыстычнам гідам.

Сяргей Сматрычэнка са студэнцкіх гадоў супрацоўнічае з вядомымі беларускімі выданнямі ("Наша Ніва", "ARCHE" і інш.), спачатку ў якасці карэктара, потым рэдактара, перакладчыка, укладальніка. Мае і досвед адміністрацыйнай працы: у 2002-2003 гг. быў выканаўчым дырэктарам тыднёвіка "Наша Ніва", у 2004-2006 гг. займаў пасаду 1-га намесніка старшыні Беларускага ПЭН-цэнтра. Яго пераклады з'яўляюцца ў друку з 1994 г. На працягу некалькіх

гадоў дзякуючы часопісным публікацыям зрабіўся прызнаным папулярызатарам чэшскай літаратуры (пазней і славацкай), ці шырэй чэшскай культуры ў Беларусі. У 2005 г. у выдавецтве “Логвінаў” заснаваў і кіруе серыяй “Чэшская калекцыя”, у якой дагэтуль выйшла з два дзясяткі кніг. Можна сказаць, што большая частка мастацкіх перакладаў з чэшскай мовы, якія з’явіліся ў Беларусі з канца 90-х гадоў, узнікла пры ўдзеле Сматрычэнкі: ці пераклад рыхтаваў сам, ці прапанаваў іншым перакладчыкам, а сам гатовы пераклад як правіла рэдагаваў. Дзякуючы сваёй працы ва ўніверсітэце, знайшоў і прыцягнуў да перакладу шэраг таленавітых перакладчыкаў з ліку сваіх былых студэнтаў (ці, часцей, перакладчыц з ліку студэнтак), з якімі цяпер працягвае ажыццяўляць розныя праекты. Ён ініцыяваў некалькі конкурсаў перакладу, у якіх узялі ўдзел дзясяткі людзей, уласным коштам падрыхтаваў і выдаў разам са студэнтамі часопіс беларускіх багемістаў “OKOlo”. Таксама ініцыяваў заснаванне першай у Беларусі перакладчыцкай прэміі, якой праз некалькі гадоў быў уганараваны і сам, за пераклад вершаў Вацлава Граб’е. Сярод іншага ўклаў сем тоўстых літаратурна-грамадскіх часопісаў, некалькі чэшскіх падборак у іншых СМІ. Шмат гадоў вядзе сустрэчы з чэшскімі і не толькі літаратарамі, кніжныя і часопісныя прэзентацыі, “прывёз” у Беларусь чэшскіх пісьменнікаў Яхіма Топала, Пэтру Гулаву, Антаніна Баяю, Марціна Фарнэра, Ірэну Доўскаву, Бару Грэгараву, Катэржыну Тучкаву, Іржы Гаічка, Пэтру Дваржакаву і інш. У яго перакладах па-беларуску загучалі празаічныя і эсэістычныя творы Яхіма Топала, Вацлава Гаўла, Багуміла Грабала, Міхала Віўэга, Эміля Гакла, Вацлава Чэрнага, Ёзэфа Шкворэцкага, Іржы Кратахвіла, Эвы Кантуркавай, Яна Пэлца, Пэтра Шабаха, Мілаша Урбана, Пэтры Дваржакавай, Маркеты Пілатавай і інш., п’есы Вацлава Гаўла і Ёзэфа Топала, вершы Вацлава Граб’е, Францішка Галаса, Карла Шыктанца, Радэка Фрыдрыха, Радэка Малага, Марыі Шцястнай, Наталіі Патэравай, дзіцячыя кнігі Мілаша Мацоўрака, Ондржэя Сэкары, Карда Чапэка, Івы Прахазкавай. Акрамя таго, рэдагуе уласна беларускія кнігі і пераклады з нямецкай, польскай, славацкай ды іншых моваў.

За папулярызацыю чэшскай культуры за мяжой у 2015 г. быў уганараваны прэміяй Іржы Тайнэра.

Трэба сказаць, што Сяргей Сматрычэнка не толькі “амбасадар” чэшскай культуры ў Беларусі, але і такі самы пасярэднік беларускай літаратуры і культуры ў Чэхіі. Ён уклаў і часткова пераклаў на чэшскую мову “Анталогію беларускага апавядання” і зборнік беларускай паэзіі “Дзве душы”, беларускія падборкі матэрыялаў ці цэлыя беларускія нумары для такіх выданняў, як “RozRazil”, “Host”, “Plav”, “Protimluv”, “Babylon”, “Navýchod”, “Labyrint revue”, “Weles”, “Pobocza” і інш., быў суарганізатарам Месяца аўтарскага чытання 2007 з удзелам 30 беларускіх аўтараў у Брне або тамсама ў 2012 г. Фестываля сцэнічнага чытання “by.BY”, у рамках якога дапамог ажыццявіць і суправаджальную праграму (фотавыставы, канцэрты). Сматрычэнка вядзе сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, іншымі творцамі ці грамадскімі дзеячамі для чэшскай публікі. У Карлавым універсітэце і Універсітэце Масарыка выкладаў беларускую мову і іншыя беларусазнаўчыя прадметы.

Сяргей Сматрычэнка жанаты, мае траіх дзяцей. Па-за працай да яго найвялікшых захапленняў належаць трэйлавы бег і турыстычныя падарожжы.